**4 снежня ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі адбыўся ўстаноўчы з'езд Саюза пісьменнікаў Саюзнай дзяржавы Беларусі і Расіі. Ініцыятарамі стварэння новай літаратурнай арганізацыі выступілі вядомыя пісьменнікі Расіі і Беларусі Валерый Ганічаў, Валянцін Распуцін, Ягор Ісаеў, Уладзімір Карпаў, Мікалай Чаргінец, Уладзімір Гніламёдаў, Алесь Савіцкі і іншыя. Ідэя правядзення форуму была падтрымана прэзідэнтамі дзвюх краін Аляксандрам Лукашэнкам і Дзмітрыем Мядзведзевым, Пастаянным Камітэтам Саюзнай дзяржавы, Патрыярхам Маскоўскім і ўсяе Русі Кірылам, Мітрапалітам Мінскім і Слуцкім Патрыяршым Экзархам усяе Беларусі Філарэтам. У рабоце ўстаноўчага з'езда бралі ўдзел каля 100 дэлегатаў, якія прынялі зварот да інтэлігенцыі і пісьменнікаў дзвюх краін, дзе, у прыватнасці, гаворыцца пра тое, што новастворaная арганізацыя ставіць сабе за мэту прапаганду твораў класікі, будзе садзейнічаць стварэнню ўмоў для развіцця новых талентаў, а таксама будзе наладжваць сувязі з творчымі арганізацыямі іншых краін. Між іншым, падагульняючы дакумент плануецца надрукаваць на тым друкарскім станку, на якім у свой час былі надрукаваны дакументы ў Белавежскай пушчы аб распадзе Савецкага Саюза. Сустаршынямі Саюза пісьменнікаў Саюзнай дзяржавы Беларусі і Расіі сталі старшыня Саюза пісьменнікаў Беларусі Мікалай Чаргінец і старшыня Праўлення Саюза пісьменнікаў Расіі Валерый Ганічаў.**

# А ты прачытаў "Ганну Карэніну"?

## або Пра тое, што без валодання літаратурай няма цікавасці да жыцця




Прыемна, што адным з самых яркіх і разам з тым непасрэдных на форуме было выступленне Міністра адукацыі Рэспублікі Беларусь Аляксандра Радзькова. А пачаў свой зварот да пісьменнікаў Беларусі і Расіі Аляксандр Міхайлавіч з адной цікавай гісторыі. У свой час вядомага савецкага кінарэжысёра, аўтара неўміручага фільма-даследавання "Звычайны фашызм" Міхаіла Ільіча Рома вельмі часта запрашалі ў прыёмныя камісіі ў тэатральныя і кінематаграфічныя навучальныя ўстановы Масквы. Усіх без выключэння абітурыентаў ён па сваёй улюбёнай звычцы прасіў пераказаць раман Льва Талстога "Ганна Карэніна", тэсціруючы такім чынам маладых людзей на прафпрыдатнасць. Што і казаць, раман няпросты і па сваім сюжэце, і па характарах, і па адносінах паміж героямі... Аднойчы ж, прытрымліваючыся сваёй традыцыі, ён запытаў пра "Ганну Карэніну" ў абітурыента Васі Шукшына, на што апошні адказаў прыблізна так: "Якая "Ганна Карэніна"? У нас на Алтаі вясной саляры не хапае для пасяўной! Няма каго за трактар пасадзіць, збожжа з цяжкасцю шукаем, каб усе палі засеяць..." І гэтак далей у такім жа духу. Выслухаўшы тыраду дзіўнаватага абітурыента з расійскай глыбінкі, члены прыёмнай камісіі толькі пацiснулі плячыма, але тут жа заўважылі, што Міхаіл Ром паставіў агромністы плюс насупраць прозвішча Шукшына. Калі Міхаілу Ільічу пачалі пярэчыць, маўляў, што вы робіце, ён жа нават не чытаў "Ганну Карэніну", той адказаў: "А вы ўяўляеце, што будзе, калі ён яе прачытае!"

У сувязі з гэтай павучальнай гісторыяй Аляксандр Міхайлавіч адзначыў, што і пісьменнікі, і педагогі выдатна разумеюць, наколькі гэта важна — каб чыталі дзеці, юнакі, маладыя, сталыя людзі. Чытанне і наогул літаратура, падкрэсліў Міністр адукацыі, з'яўляюцца надзвычай важным складнікам развіцця асобы, выхавання і навучання. І ў многім, ствараючы літаратуру і навучаючы ёй ды іншым прадметам, пісьменнікі і настаўнікі робяць адну справу — робяць з чалавека чалавека. Але як навучыць сёння людзей чытаць? Задаўшыся гэтым пытаннем, Аляксандр Радзькоў падзяліўся сваімі асабістымі назіраннямі з сучаснай школы: "Звычайна, калі прыязджаю ў якую-небудзь школу, я пачынаю яе аглядаць з бібліятэкі і заўважаю, што маленькіх дзяцей там заўсёды поўна. Яны там як той гарох. Сярэдніх школьнікаў ужо значна менш. А старшых і наогул практычна няма... Значыць, на нейкім адукацыйным звяне ў пэўным узросце беззваротна губляецца цікавасць школьнікаў да кнігі і да чытання. Бібліятэкары мне кажуць, што не хапае тоненькіх кніжачак, напісаных даступнай мовай на даступныя дзецям тэмы, а добра яшчэ, каб з прыгожымі малюнкамі і вялікімі літарамі. Не хапае якраз тых кніжак, праз якія дзеці прывучаюцца чытаць і адкрываюць для сябе свет літаратуры. А я, напрыклад, памятаю сваю першую кніжку, якую я прачытаў, як толькі навучыўся чытаць. Яна называлася "Карасік", і гэтая кніжачка са мной будзе ўжо ўсё жыццё..." У школе, падкрэсліў Аляксандр Міхайлавіч, абавязкова павінна захоўвацца паслядоўнасць у падтрыманні цікавасці вучняў да чытання, каб праз першыя маленькія кніжачкі літаратурай захапляўся першакласнік, каб праз больш складаныя і адпаведныя псіхалогіі тынейджэра кнігі (магчыма, з падключэннем такіх жанраў, як фэнтэзі ці прыгодніцкі) цікавасць да кнігі не страчваў сярэдні школьнік, і так, менавіта паслядоўна — да "Ганны Карэнінай" і іншых бессмяротных сур'ёзных класічных твораў...

Аляксандр Радзькоў закрануў у сваім выступленні і такі важны момант, як роля і магчымасці пісьменніка ў сённяшнім высокатэхналагічным і інфармацыйна насычаным свеце. Хвалю добрых эмоцый ва ўдзельнікаў устаноўчага з'езда Саюза пісьменнікаў Саюзнай дзяржавы Беларусі і Расіі выклікаў непасрэдны зварот да іх Міністра адукацыі: "Сёння і пісьменнікам, калі яны хочуць быць пачутымі, трэба выкарыстоўваць самыя розныя тэхналагічныя дасягненні. Ёсць кнігі не толькі на папяровых носьбітах, але і на электронных, ёсць відэапрадукцыя, ёсць камп'ютарныя праграмы... Усё гэта працуе, усё гэта з'яўляецца даступным, асабліва для маладога пакалення. Калі ласка, пішыце сцэнарыі фільмаў, стварайце сцэнарыі для камп'ютарных праграм, каб, напрыклад, нават ужо дарослы чалавек сеў за камп'ютар, а там на экране высвецілася: "А ты прачытаў "Ганну Карэніну"? Пачытай! І толькі тады ты зможаш працаваць далей!" У гэтым сэнсе, безумоўна, мы ўсе, і пісьменнікі, і педагогі, і навукоўцы, павінны быць разам. Таму што без слова, без душы, без цёплага стаўлення да літаратуры і без валодання літаратурай няма ні цікавых зносін паміж людзьмі, ні наогул цікавасці да жыцця..."

"Сёння ў Беларусі многае зроблена і робіцца для таго, каб настаўнікі і пісьменнікі былі разам у адукацыйным працэсе. Мне вельмі прыемна, што мы з Саюзам пісьменнікаў Беларусі знайшлі ўзаемаразуменне, аднавілі выданне "Школьнай бібліятэкі", з дапамогай пісьменнікаў перапрацоўваем вучэбныя праграмы (каго туды ўключыць, у якім аб'ёме), іх экспертная ацэнка і падказкі для нас вельмі важныя. А цяпер у саюзе з расійскімі пісьменнікамі, з гэтай магутнай літаратурнай школай і магутнымі літаратурнымі традыцыямі, мы зможам яшчэ больш тонка вызначыць, колькі павінна быць класікі ў вучэбнай праграме, колькі павінна быць сучасных аўтараў, як наогул дасягнуць таго, каб праз чытанне развівалася сапраўдная асоба", — адзначыў Міністр адукацыі напрыканцы свайго выступлення.

...А літаральна днямі некаторымі развагамі і асабістымі ўспамінамі, якія навеяў устаноўчы з'езд Саюза пісьменнікаў Саюзнай дзяржавы, Аляксандр Міхайлавіч Радзькоў падзяліўся з нашым карэспандэнтам:

"Калі я працаваў ва ўніверсітэце, заўсёды, сыходзячы ў чарговы адпачынак, прасіў універсітэцкага бібліятэкара падабраць мне бібліятэчку — каб было штонебудзь новага пачытаць. Памятаю, аднойчы яна паклала мне "Лаліту" Набокава, і я запярэчыў, маўляў, не вельмі люблю Набокава, яго мова мне не падабаецца... Але яна ўсё-такі мяне ўгаварыла: "Аляксандр Міхайлавіч, вазьміце, не пашкадуеце. Увесь свет чытае, і вы павінны пачытаць". І я, сапраўды, не пашкадаваў, калі прачытаў. Гэтая кніга мяне вельмі ўзбагаціла ў плане ўспрымання самога Набокава і наогул у светаразуменні...

Усё-такі заўсёды чалавек, асабліва пісьменнік, павінен знайсці нешта сваё. Набокаў знайшоў сваю Лаліту, Шукшын — сваіх дзівакоў, людзей небеззаганных, але затое добрых, чыстых, адкрытых... Напэўна, ён і сам быў такім, таму і сёння застаецца цікавым... І Распуцін знайшоў свайго непаўторнага героя, і Палякоў, я ўжо не кажу пра геніяў літаратуры, такіх, напрыклад, як Пушкін. Не так даўно я неяк перачытваў яго "Капітанскую дачку", і мяне асабліва ўразіла тое, што гэты твор напісаў зусім малады чалавек, але якая глыбокая ацэнка падзей, якая назіральнасць, логіка, мудрасць!

Я гэта ўсё кажу да таго, што кожны сапраўдны пісьменнік — гэта заўсёды божы дар. У пісьменніка асаблівае чуццё на ўсё, у тым ліку і на выхаванне чалавека. І, натуральна, пісьменнікі павінны прысутнічаць у нашым штодзённым культурным жыцці, у адукацыйным працэсе. Таму, уласна кажучы, я і палічыў сваім абавязкам адгукнуцца на запрашэнне паўдзельнічаць ва ўстаноўчым з'ездзе Саюза пісьменнікаў Саюзнай дзяржавы, бо лічу, што чым больш побач з намі будзе яркіх асоб, яркіх падзей і яркіх твораў, тым лепш... Стварэнне саюза — добры крок, на карысць і нам, і расіянам... Гэта ў першую чаргу ўзбагачэнне нашага духоўнага жыцця.

А што тычыцца пытання аб павышэнні цікавасці дзяцей да чытання, то я хацеў бы дадаць, што не толькі пісьменнікі і настаўнікі павінны працаваць на гэтую задачу, але і сям'я. Мне ў гэтым сэнсе пашанцавала. Мае бацькі выпісвалі ўсё, што можна было выпісваць: і дзіцячыя газеты, і тоўстыя літаратурныя часопісы, і навукова-папулярныя выданні... "Юность", "Роман-газета", "Советская Белоруссия", "Иностранная литература", "Наш современник", "Октябрь", "Знамя", "Дружба народов", "Мурзилка", "Правда", "Комсомольская правда", "Знамя юности", "Вожык", "Нёман"... Ды ўсяго нават не пералічыць! І гэта было сапраўднае свята ў нашай сям'і, калі паштальён прыносіў пошту — агромністы пакет з разнастайнай перыёдыкай! Нешта бацька раіць прачытаць, нешта — маці, брат брату пераказвае... Так, мне здаецца, і павінна быць.

Кніга, часопіс, газета абавязкова павінны быць у сям'і. Прычым яны павінны быць літаральна ўсюды ў доме: штосьці — у дзіцячым пакоі, штосьці — на кухні, яшчэ нешта — у калідоры, у зале... Кнігу (часопіс, газету) усё-такі нічога не заменіць — ні радыё, ні тэлевізар, ні камп'ютар. Кніга — гэта, нарэшце, асаблівы, непараўнаны пах.

Без кнігі — як і без настаўніка. Людзі ніколі не змогуць абысціся без настаўніка. Без яго жывога слова, жывога погляду, жывога жэста, жывога прыкладу..."

**Мікола ЧЭМЕР.**
**Фота БелТА.**